ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З КРАСАВІКА 1955 ГОДА ● № 9 (3645) ● СЕРАДА, 29 ВЕРАСНЯ, 2021

ВЫДАННЕ “ГОЛАС РАДЗІМЫ” ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY



Святыні нас яднаюць у народ
Стар. 4



Родныя песні на Байкале
Стар. 6



Ажыў гадзіннік вежавы
Стар. 7

СВЕТАПОГЛЯД

Свята нашага адзінства

У Беларусі – новае свята. 17 верасня мы ўпершыню адзначалі Дзень народнага адзінства.

Выступаючы 17 верасня ў “Мінск-Арэне” на форуме патрыятычных сіл, прысвечаным Дню народнага адзінства, Прэзідэнт Беларусі адзначыў: у Год народнага адзінства была агучаная і падтрыманая большасцю беларусаў прапанова зрабіць дзень 17 верасня новым дзяржаўным святам. “Таму што для нас ён даўно з’яўляецца сімвалам беларускай дзяржаўнасці, запаветам будучым пакаленням. Запаветам берагчы суверэнітэт краіны, нацыянальнае адзінства і мір на роднай зямлі", – прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка.

У часе выступлення Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў: “У дачыненнях з усімі мы імкнемся да міру і сяброўства. Мы ніколі не квапіліся на чужы каравай або кавалачак зямлі. Нам свайго хапае. Мы нават не нагадваем сёння ім пра тое, што Беласток і Беласточчына – гэта беларускія землі, што Вільня – гэта таксама беларускі горад, і землі вакол. Мы ж пра гэта не гаворым! Унутрыканфесійная раўнавага і міжнацыянальнае адзінства – непарушная аснова нашага грамадства”.

Аб’яднанне БССР і Заходняй Беларусі ў межах адной рэспублікі – гэта ж параўнальна нядаўна было, калі глянуць на гістарычныя падзеі вачыма нашых землякоў з Заходняй Беларусі. Да свята гісторыкі беларускія дасталі, паказалі шмат вельмі цікавых дакументаў, што сведчаць, як усё тое адбывалася, без прыўкрас ды сарамлівага “прысядання”: а раптам нас недзе там не так зразумеюць. У прыватнасці, яшчэ ўлетку грунтоўная размова з навукоўцамі прайшла ў рэдакцыі газеты “Звязда” (гл. “Дзень, які нам варта адзначаць. Што значыць для беларусаў дата 17 верасня і чаму пра гэта трэба памятаць і ведаць” – Звязда, 21.06.2021.) У часе яе кандыдат гістарычных навук, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім Лакіза, у прыватнасці, адзначаў: “Калі прымалася рашэнне аб прапанове даты Дня народнага адзінства, гаварылі пра 17 верасня або 14 лістапада, і сярод экспертаў гучала думка: маўляў, мы кагосьці пакрыўдзім. Але мы не павінны аглядвацца на кагосьці, мы павінны адстойваць свае нацыянальныя інтарэсы і



падаваць гісторыю з пункту гледжання беларусаў, а не кагосьці з суседзяў”. А для аргументацыі, прадоўжыў навукоўца, напрацаваны велізарны матэрыял: “Сёлета Інстытут гісторыі ды Акадэмія кіравання правялі канферэнцыю, прысвечаную 100-годдзю Рыжскага міру, прычым не толькі на сваіх пляцоўках, але і ў іншых ВНУ. У 2019-м ладзілі навуковую канферэнцыю, прымеркаваную да 80-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі і БССР, вынікам якой стаў падрыхтаваны зборнік матэрыялаў “Назаўжды разам”...


Ды не толькі архівы могуць прыадкрыць нам праўду пра падзеі верасня 1939-га. Яшчэ й цяпер людзі паважанага веку згадваюць мінулае, што адбілася ў іхняй, тады маладой памяці назаўсёды. Некаторыя й “за польскім часам” у школы хадзілі. Тата мой, 1930 года нараджэння, згадваў не раз убіты яму ў галаву (відаць з 37 па 39-ы…) просценькі вершык-агітку: “Кто ты естэш? – Поляк малы. Які знак твуй? – Ожэл бялы”. Ну але які ж ён, аднак, быў паляк? Бедная сялянская сям’я з-пад Клецка, прычым праваслаўнага веравызнання… Апынулася, як і сотні тысяч іншых, ва ўладзе Польшчы ў выніку сумна вядомага Рыжскага міру з 1921 года. Што яшчэ цікава: і ў нашай невялічкай вёсцы Яцкаўшчыне жыў, старэйшы за майго тату, Аляксей Ждановіч. Казалі ў нас, што ўваходзіў у суполку ці то камсамольскую, ці то партыйную: Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Што падарвалі яго нае здароўе каты з польскай дэфензівы ў сумна вядомай Бярозе-Картузскай.

Хварэў чалавек, “бо на допытах і газу ў нос лілі, голкі пад ногці заганялі”, ды й памёр дачасна.

Што да слова дэфензіва, то яго цяпер не ва ўсіх слоўніках знойдзеш. Састарэлае, засталося ў тым часе, калі, як гнеўна пісаў Янка Купала “нашу Айчыну Без нашае волі, Як тую аўчыну Ў шматкі папаролі”. Але нам варта ўсё ж памятаць: такая дзяржарганізацыя была ў Польшчы ў пару між Першай і Другой сусветнымі войнамі, яе службоўцы займаліся контрразведкай, да таго ж выконвала ролю палітычнай паліцыі. Таксама не забудзем, што дэфензіва катавала нашых продкаў за само жаданне “беларусамі звацца” ў згаданым канцлагеры польскім, створаным у 1934 годзе. Цяпер мы згадваем: быў перыяд, калі ў пасляваенны час, з 1949-га, у сілу палітычных прычын – каб не ўгнявіць, не засмуціць “таварышаў” з сацыялістычнай Польшчы – беларусы згарнулі сваё Свята ўз’яднання. А дарма. Сваю гісторыю варта памятаць. Рабіць з яе высновы.

Новае дзяржаўнае свята мы адзначалі ўпершыню. Па ўсёй краіне, ва ўсіх рэгіёнах прайшлі разнастайныя імпрэзы, яму прысвечаныя. І гэта – заканамерна, бо дзень 17 верасня для беларусаў – гэта дзень нашай гістарычнай памяці. А яна, калектыўная наша памяць, паядноўвае людзей ды эпохі, перадае каштоўны досвед папярэднікаў і засцерагае ад фатальных памылак.

Іван Ждановіч



УСЕ ФАРБЫ

Дзень пісьменства ў Капылі

Дзень беларускага пісьменства святкуецца шмат гадоў, і гэта на Беларусі ўжо добрая традыцыя. Сёлета прысвечана было свята Году народнага адзінства, прайшло пад дэвізам “Слова нас аб’ядноўвае”.

Пісьменнікаў, аматараў прыгожага пісьменства на гэты раз вітаў Капыль. А зямлю Капыльскую праславілі больш за паўсотні празаікаў і паэтаў, сярод іх Кузьма Чорны, Мікола Хведаровіч, Адам Русак, Ян Скрыган, Сцяпан Аляксандровіч ды іншыя творчыя асобы.

Цёпла сустракаў гасцей горад, адметны пагорыстым ландшафтам. І Мікола Хведаровіч пра тое пісаў: “Стаіць на пагорках, на ста сямі горках мой любы, мой родны Капыль”. Упершыню ў пісьмовых крыніцах паселішча згадваецца у 1006 годзе. На пачатку XIV стагоддзя Капыль увайшоў у склад Вялікага Княства Літоўскага, і амаль два стагоддзі правіла ў ім дынастыя князёў Алелькавічаў. З 1612-га перайшоў ва ўладальніцтва князёў Радзівілаў, а ў 1652-м Капыль атрымаў ад караля Яна Казіміра Магдэбургскае права ды з ім свае герб і пячатку. У 1924-м стаў райцэнтрам. Дарэчы, на свяце ў Капылі прэзентавалі новы турмаршрут: “Да крыніц Нёмана і Капыльскіх святыняў”. Першымі яго прайшлі ўдзельнікі выязнога семінара па Мінскай вобласці “Турыстычны патэнцыял Уздзеншчыны і Капыльскага раёна”, прымеркаванага да Дня беларускага пісьменства. Прыня ўранні прыбыла Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя “Дарога да Святыняў” з Жыватворным Агнём ад Гроба Гасподняга. Яна стартавала 1 верасня ад мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора, прайшла каля 780 кіламетраў праз Баранавіцкі, Ганцавіцкі, Лунінецкі, Салігорскі ды Уздзенскі раёны і завяршылася ў сёлетняй сталіцы Дня беларускага пісьменства. На сваім шляху святары, вядомыя дзеячы навукі, культуры і мастацтва наведвалі храмы, навучальныя ўстановы, дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты, дамы састарэлых, бібліятэкі, музеі, правялі там духоўна-асветніцкія, літаратурныя і музычныя імпрэзы. Удзельнікі экспедыцыі даставілі Жыватворны Агонь у капыльскі храм Ушэсця Гасподняга на святочнае набажэнства. І ўсе ахвочыя змаглі запаліць свечкі ад Незгасальнай лампады.

→ Стар. 3



Помнік Цішку Гартнаму

вабнае для турыстаў старажытнае Замчышча ці Замкавая гара непадалёк ад зліцця рэчак Каменкі і Мажы. Гісторыкі сцвярджаюць: у XIV стагоддзі на Замкавай гары стаяў замак, і раней, да яго ўзвядзення было там гарадзішча.

Найбольш насычаным на падзеі быў другі дзень свята. У горад 5 верас-

ISSN 0439-3619
9 770439 361003 21009

ПРАДАЎЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

Каб мову мець і звацца чалавекам

З нагоды Дня беларускага пісьменства і ў латышскім Даўгаўпілсе працавала літаратурная гасцёўня

Ёсць важныя даты, святы ў беларускім календары, якія ўплываюць на жыццё нашае ў замежжы. З іх улікам праходзяць і творчыя імпрэзы ў Даўгаўпілскім Цэнтры беларускай культуры (ЦБК). Прыкладам, 3 верасня 2021 года зладзілі мы літаратурную гасцёўню, прымеркаваную да Дня беларускага пісьменства. І якраз такім чынам стартаваў новы творчы сезон у ЦБК.

"З глыбокай старажытнасці – спрадвеку,/ каб з плеч сагнутых скінуць гнёту груз,/ каб мову мець, каб звацца Чалавекам,/ цягнуўся да асветы беларус". Гэтыя паэтычныя радкі паэта-палешука Міколы Федзюковіча прачытала на пачатку сустрэчы, прысвечанай святу Слова і Кнігі, кіраўніца ЦБК Жанна Раманоўская. Нагадала ўдзельнікам імпрэзы гісторыю ўзнікнення свята, як яно жыве-развіваецца, якія гарады станавіліся ў розныя гады яго сталіцамі, а таксама пра даўнюю прысутнасць беларускай мовы на лінгвістычнай карце Еўропы. Ёй, ураджэнцы Полаччыны, прыемна было адзначыць, што ў 1994-м традыцыя адзначаць Дзень духоўнасці, літаратуры й культуры закладзена была менавіта ў старажытным Полацку, на радзіме Францыска Скарыны – асветніка, заснавальніка



Жанна Раманоўская дэманструе рэдкі альбом з бібліятэкі Беларускага дома

ўсходнеславянскага кнігадруку. Полацк ужо тройчы станавіўся сталіцай Свята.

У імпрэзе паўдзельнічаў Генеральны консул Беларусі ў Даўгаўпілсе Ілья Лапуць. Віктаравіч ды выказаў надзею, што наша родная мова будзе развівацца й зберагацца ў тым ліку і этнічнымі беларусамі з замежжа. І сапраўды: мы, беларусы ў Даўгаўпілсе, працуем у сілавым полі беларускай культуры, робім свой унёсак у яе пашырэнне. Нашы сябры з беларускай суполкі "Уздым" пішуць мастацкія творы на роднай мове. Асабліва плённа працуе сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі Станіслаў Валодзька – ён і прачытаў некалькі вершаў на роднай мове, якую лічыць першаасновай нацыі. Паэт з гонарам казаў, што ўжо двойчы быў на святах у сталіцах Дня беларускага пісьменства – у Шклове ды Шчучыне, падзяліўся сваімі ўражаннямі. Ён лічыць, што пабываць хоць раз на такім святе варта кожнаму беларусу. Далей свае вершы пра родную зямлю, яе прыгажосць і сілу чытала Лілія Воранава.

"Беларуская мова ёсць адна з найважнейшых крыніц высокай духоўнасці нашага народа, невычэрпны, найбагацейшы матэрыял для даследавання й вывучэння", – адзначыў Ілья

Супрацоўнікі ЦБК – мы з Ірынай Апэйнанэ – зрабілі невялікую відэапрэзентацыю пра Капыль, што стаў сёлета сталіцай свята. Напрыканцы імпрэзы прайшла віктарына "Сталіцы духоўнага шляху", а Жанна Раманоўская знаёміла гасцей з падоранымі кнігамі, якія папоўнілі бібліятэку Беларускага дома за апошні год. Сярод іх і бібліяграфічная рэдкасць – альбом "Беларускі народны арнамент" (1953), гэта падарунак дачкі беларускі, якая вышывала па кніжных узорах сваё рукадзельнае адзенне. Ёсць цяпер у нашым кнігазборы новае выданне Вячкі Целеша "Ваўкавыскія паштоўкі 1910–1939. Каталог" (2021, Рыга), кніга Максіма Каралёва і Андрэя Герберга "Латышская аперацыя ў БССР" (2021, Рыга) ды іншыя.

Удзельнікі літаратурнай гасцёўні захоплена гаварылі пра родную мову, беларускае пісьменства, згадвалі жывыя слоўцы з мясцін, дзе нарадзіліся-жылі ды падтрымалі ініцыятыву Жанны Раманоўскай: штогод на пачатку верасня адзначаць Дзень беларускага пісьменства. У часе яго мяркуем прэзентаваць і кнігі даўгаўпілскіх беларускіх аўтараў, выдадзеныя за год. І тым самым будзем спрыяць зберажэнню роднай мовы, нацыянальнай ідэнтычнасці, пераемнасці духоўных традыцый.

Марыя Памецька,
метадыстка Цэнтра беларускай культуры,
г. Даўгаўпілс
Фота: Ірына Апейнанэ

КАШТОЎНАСЦІ

"Буквар" як сімвал гонару

Новы беларускамоўны "Буквар" выдадзены для першакласнікаў

У Нацыянальнай бібліятэцы 3 верасня прайшла прэзентацыя новага выдання. Намеснік генеральнага дырэктара Аляксандр Суша наконт яго выказаўся аптымістычна: "Практычна з гэтага дня пачынаецца новая эпоха ў гісторыі беларускага буквара, якая сама па сабе вельмі багатая, розная і цікавая. Гэта адзін з брэндаў Беларусі, сімвал гонару нашых продкаў і нас у тым ліку". Аляксандр Аляксандравіч як ніхто іншы ведае пра 400 гадоў гісторыі беларускага буквара. Нагадаем, ён у 2018-м стаў ініцыятарам факсімільнага перавыдання першага ў свеце "Буквара", што ў 1618 годзе выйшаў з друкарні Віленскага праваслаўнага



брацтва Святога Духа ў мястэчку Еўе (цяпер Віевіс, тэрыторыя Літвы). Зберагліся з таго часу толькі два яго асобнікі. На думку навукоўцаў, менавіта беларускія асветнікі, друкары на працягу некалькіх стагоддзяў мелі прамое дачыненне да выдання розных "Буквароў".

Свае школьныя буквары і мы памятаем. Дарэчы, дагэтуль першакласнікі ў Беларусі больш за паўстагоддзя садзіліся за парты з "Букваром" Анатоля Клышкі. Ён быў створаны ў 1968-м, перамагаў на кніжных выставах СССР, а ў 1977-м годзе атрымаў залаты медаль Міжнароднай Лейпцыгскай выставы.

Аўтары новага "Буквара" такама спадзяюцца на доўгае жыццё сваёй кнігі. Гэта дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржпедуніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга Свірыдзенка і вядучая навуковая супрацоўніца Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга Цірынава. Пры складанні "Буквара" выкарыстаны розныя метады навучання грамаце. Выканаць заданні сучасным дзецям дапамагаюць Кірыліца і Жэўжык – галоўныя героі кнігі ды мультфільмаў: іх у дадатак да "Буквара" стварылі на кінастудыі "Беларусьфільм". Пра 6-гадовую гісторыю стварэння тых мультфільмаў на прэс-канферэнцыі расказалі дырэктар кінастудыі Уладзімір Карачэўскі, мастак-аніматар Канстанцін Андрушачкін і рэжысёр Ірына Тарасава.

У "Буквар" уключаны заданні й практыкаванні, якія адлюстроўваюць каштоўнасці нашай культуры, і гэта – адна з кніжак вялікага навучальна-метадычнага комплекса. У дапамогу яму ёсць "Рабочы сшытак для Буквара" і "Пазакласнае чытанне" – з адпаведнымі творамі, падабранымі з улікам узросту вучняў. Карыснай для першакласнікаў будзе "Пропісь з анімацыяй". На кожнай старонцы там побач з літарамі – QR-коды. Яны дапамагаюць знайсці ў інтэрнэце анімацыйныя ролікі з дэманстрацыяй напісання ўсіх літар алфавіта. У кастрычніку выйдзе "Спадарожнік буквара": для дзяцей, якія ўмеюць чытаць. Сярод іншых там ёсць рубрыка "Ведай свой край": побач з назвамі турыстычных цікавостак Беларусі – зноў QR-коды, каб глядзець відэафільмы.

Над навучальна-метадычным комплексам працаваў аўтарскі калектыў Нацыянальнага інстытута адукацыі Мінадукацыі Беларусі.

Ганна Лагун

СЦЕЖКАМІ ПАМЯЦІ

Пад Ржэвам і Масквой

Актывісты беларускіх суполак Расіі наведалі Ржэўскі мемарыял Савецкаму салдату і мемарыял "Героям-панфілаўцам" у Маскоўскай вобласці

Сёлета споўнілася 80 гадоў ад пачатку Вялікай Айчыннай вайны, і ў памяць пра герояў, іх подзвігі шэраг акцый пад дэвізам "Священную память храня обо всем, мы помним…" ладзіць Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія Беларусаў Расіі. Мне пашчасціла быць сярод актывістаў суполак з рэгіёнаў Расіі, якія наведвалі ў верасні Ржэўскі мемарыял Савецкаму салдату і мемарыял "Героям-панфілаўцам". З падтрымкай Федэральнага агенцтва па справах нацыянальнасцяў зладзілі паездку старшыня ФНКА Беларусаў Расіі Сяргей Кандыбовіч і Аляксандр Дарковіч – Герой Расіі, першы намеснік старшыні, выканаўчы дырэктар суполкі, адказны за напрамак па патрыятычным выхаванні.



Здымак на памяць ля мемарыяла "Героям-панфілаўцам"

Несумненна: змагаліся з ворагам у вайну прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. І ў кровапралітных баях пада Ржэвам гінулі нашы супляменнікі. (Адна са згадак пра тое: "Трафім загінуў пад Ржэвам" – ГР, 29.07.2021. – **Рэд.**) Да таго ж і ў Аляксандра Твардоўскага, аўтара знакамітага верша "Я убит подо Ржевом…" былі моцныя беларускія родавыя карані. У чэрвені 2021-га ўрачыста быў адкрыты Ржэўскі мемарыял Савецкаму салдату. І мы аддалі даніну павагі героям.

Наведваючы мемарыял "Героям-панфілаўцам" (афіцыйная назва "Подзвігу 28") у пасёлку Дубасекава, што ў Валакаламскім раёне Падмаскоўя, мы згадалі й пра беларуса Пятра Гундзіловіча. Ён камандаваў 4-й ротай, якая прыняла смяротны бой з ворагам. Пасля векапомных падзей камандзір 1075 палка Капраў пісаў, што ў баі 16 лістапада 1941 года найбольшыя страты панесла рота Гундзіловіча. Са 120 байцоў ацалела толькі 20-25 разам з камандзірам. А палітрук роты Клачкоў (яму прыпісваюць знакамітую фразу "Велика Россия, а отступать некуда – позади Москва!") па-геройску загінуў, кінуўшыся пад варожы танк са звязкай гранат.

Завяршылася наша паездка ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі. На памятным мерапрыемстве-рэквіеме "Заўтра была вайна", тэматычным канцэрце былі й маладыя танкісты з Беларусі: удзельнікі танкавага біятлона на палігоне ў Алабіна і Міжнародных вайсковых гульняў.

Павел Сідарук, старшыня савета Кабардзіна-Балкарскага грамадскага руху "За яднанне – Сябры"

УСЕ ФАРБЫ

Дзень пісьменства ў Капылі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З самай раніцы й госці сабраліся пры Капыльскім раённым краязнаўчым музеі ў цэнтры горада, каб адкрыць помнік майстру слова, земляку Цішку Гартнаму. Якраз на месцы музея раней была гарбарная майстэрня, дзе і працаваў з 13-і гадоў Зміцер Жылуновіч (ён узяў пазней літаратурны псеўданім Цішка Гартны). Мала хто сёння ведае пра такую старонку яго біяграфіі, часцей Цішку Гартнага згадваюць як пісьменніка, драматурга, літаратурнага крытыка, перакладчыка, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, да таго ж акадэміка Акадэміі навук БССР. А перад намі, як было знята покрыва з помніка, слынны капыльчанін паўстаў маладым і летуценным, з залацістым капылом (калодкай, на якой майстар-гарбар выбрабляў абутак) у руках. Вядоўца імпрэзы пажартавала: то магчыма і назва Капыля можа паходзіць ад такога капыла? І такая версія верагодная, бо ў мястэчку здаўна жылі-працавалі гарбары, якія выраблялі скуры, шылі з іх абутак. “Я рабочы-гарбар,/ Рыцар працы цяжкой,/ Я з жалезнай душой,/ З сэрцам палкім, як жар…/ Не хачу, не прывык,/ Склаўшы рукі хадзіць:/ Я гарбар – працаўнік,/ Я жыву – каб рабіць”, – гэтак Цішка Гартны пісаў пра сябе. І тыя словы



На святочнай сцэне



Віктар Праўдзін



Уладзімір Ліхадзедаў паказвае ганаровым гасцям свята сваю новую кнігу

ўвекавечаны на помніку (аўтары яго – скульптар Павел Вайніцкі ды архітэктар Алеся Атрашкевіч). Аблічча пісьменніка зроблена паводле рэдкага здымка, які раней мала хто бачыў.

Дзверы Краязнаўчага музея адкрыліся для наведнікаў адразу пасля рамонту, пакоі – з пахамі свежай фарбы. На свята ў музеі прэзентавалі новыя кнігі, ладзілі выставы. Пашчасціла мне патрапіць на прэзентацыю кнігі публіцыста, ураджэнца Капыля Льва Клейнбарта “Сустрэчы. Янка Купала”. Дзвюхмоўнае выданне з серыі “Адрасы беларусаў у свеце” ажыццёўлена па заказе і пры фінансавай падтрымцы Мінінфармацыі Беларусі. Над складаннем кнігі працаваў калектыў ВД “Звязда”, яго дырэктар – галоўны рэдактар “Звязды” Алесь Карлюкевіч і пераклаў тэксты з рускай мовы. На прэзентацыі ён расказаў пра стасункі Льва Навумавіча і Янкі Купалы. Мы пабачылі й лісты-перапіску між імі. У другой зале музея працавала выстава, зладжаная супрацоўнікамі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Часовая экспазіцыя “Туды, на захад! (Абаянь – Мінск)” прымеркаваная да 100-годдзя вяртання класіка ў Беларусь. Аказваецца, Якуб Колас шмат выкладаў: на Куршчыне, а па вяртанні і ў Белпедтэхнікуме, БДУ. Збярогся фотаздымак, зроблены на настаўніцкіх курсах у Слуцку. І навукай пісьменнік займаўся: у Інбелкульце ды Акадэміі навук. Пазнавальная настольная гульня “Жыццё па Коласу” высвечвае найбольш значныя моманты з біяграфіі паэта.

Яшчэ адной значнай падзеяй на святе стала ўрачыстае адкрыццё Алеі пісьменнікаў. Сімвалічную чырвоную стужку перарэзалі намеснік Прэм’ер-міністра Ігар Петрышэнка, Міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў, старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын, старшыня Капыльскага райвыканкама Сяргей Пілішчык. Яны ж першымі прайшліся па алеі. Сярод цяністых дрэваў на пастаментах устаноўлены 17 вялікіх літар з цэглы, побач з кожнай – дзве лаўкі для адпачынку. Кожную “літару” афармілі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, QR-кода. Скануеш гэты код смартфонам – і лёгка пераходзіш на старонкі ў інтэрнэце, прысвечаныя жыццю і творчасці пісьменнікаў, ураджэнцаў Капыльшчыны.



На ўрачыстым адкрыцці Дня беларускага пісьменства шмат цёплых слоў гаварылася і ў адрас сучасных пісьменнікаў, пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі (заснавана ў 2015 годзе). Арганізуюць конкурс Мінінфармацыі, Мінкультуры, Мінадукацыі ды Саюз пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэатаў-2021 вітаў старшыня СПБ Мікалай Чаргінец. У намінацыі “Лепшы твор (зборнік твораў) паэзіі” ўшанаваны аўтар зборніка “Белае, чорнае і залатое” Віктар Шніп. “Лепшым творам прозы” прызнана кніга “Парыж, Эйфелева вежа і ...” Віктара Праўдзіна. Аляксандра Карлюкевіча ўшанавалі ў намінацыі “Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства” за кнігу “Пухавіччына. Літаратурнае гняздо Беларусі”. А сярод аўтараў публіцыстычных твораў адзначаны Аляксандр Радзькоў – за кнігі “Дыскрэтны падыход да назірання жыцця” і “Мой фізмат” (серыя “Люстэрка лёсу”).

Пасля святочнага канцэрта госці трапілі ў прастору Фестывалю кнігі й прэсы, яго павільёнаў з кнігамі ды газетамі. Хтосьці набыў новую кніжку, нехта браў дамоў пачытаць розных газет. Да мяне трапілі копіі некаторых газет 1921 – 1939 гадоў: “Беларускія ведамасьці”, “Беларускі звон”, “Сялянская ніва”, “Авадзень”. Цікава пачытаць, пра што пісалі тады. А ёсць жа публікацыі там і “ў тэму” нашага выдання: пра людзей розных нацыянальнасцяў, пра самасвядомасць беларусаў. Пэўна што раней тэма была вельмі актуальнай. Вось, прыкладам, артыкул у “Беларускіх ведамасьцях” (1921), перадрук з “Роднага краю”. Чытаем: “На зямлі беларускай жывець народу нямала – мільёнаў 16 усіх будзе. Беларусоў будзе мільёнаў 12. Апрача беларусоў, жывуць тут ліцьвіны, жыды, ёсць крыху палякоў, стараверaў-маскоўцаў, немцаў, латышоў, татараў. Ня ўсе беларусы ведаюць, хто яны такія”.

Копіі газет 1921 – 1939 гадоў і дэманстравалі, і раздавалі на цэнтральнай плошчы свята, у павільёне “Адзінства”, прысвечаным Году народнага адзінства. Выставу газет і часопісаў падрыхтавалі Мінінфармацыі ды Нацыянальны гістарычны музей. Там жа прэзентаваў сваё выданне “17 верасня – Дзень народнага адзінства” гісторык, калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў. “Кніга расказвае пра падзеі аб’яднання Заходняй Беларусі і БССР , і адначасова пра шматнацыянальнасць і шматканфесійнасць нашай краіны ў тыя часы. І тым самым паказвае, што людзі, якія тут жылі, нягледзячы на сваю нацыянальнасць, на рознае веравызнанне, лічылі сябе карэннымі жыхарамі”, – казаў аўтар падчас нашай размовы. У новае выданне ўвайшлі рэдкія фотаздымкі, яно сугучнае з ранейшым “Шматнацыянальная Беларусь. Дакрануцца душой, адчуць сэрцам” – пабачыла свет летась, прымеркавана да Фестывалю нацыянальных культур. Калекцыянер прадставіў у Капылі пісьмовы прыбор Сяргея Прытыцкага, які падпісваў у Маскве дакументы па ўваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР. Прадэманстраваў Уладзімір Ліхадзедаў і аловак дэлегата з’езда, на якім было абвешчана аб’яднанне Беларусі. Нацыянальны гістарычны музей прадставіў наведнікам плашч і кабуру пісталета Сяргея Прытыцкага.

У павільёне “Традыцыі і сучаснасць” нам паказалі абрады Капыльшчыны. Адзін з іх – “Цары”, вядомы толькі ў вёсцы Семежава. Занесены ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА. У тым жа павільёне Капыльскі раённы цэнтр традыцыйнай культуры ды мясцовы Краязнаўчы музей прэзентавалі вясельны абрад “Апекуны шчасця”. Узнавіць яго на свяце дапамаглі выкладчыкі й навучэнцы Капыльскага дзяржаўнага каледжа. Вельмі ўразілі відавочцаў дзеі вясельная сукенка маладой ды ўбор жаніха, пашытыя ў 60-я гады мінулага стагоддзя.

Усяго на Фестывалі кнігі й прэсы працавала 5 тэматычных павільёнаў: “Традыцыі і сучаснасць”. “Памяць”, “Разам з кнігай мы расцём”, “Адзінства”, “Слова пісьменніка”.

Нагадаем чытачам, што сталіцамі Дня беларускага пісьменства штогод становяцца розныя гарады Беларусі, якія здаўна былі вядомыя ў нашым свеце як цэнтры кнігадрукавання й літаратуры, асветніцтва й культуры. Сталіцамі свята былі Полацк, Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаўль, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае, Быхаў, Шчучын, Рагачоў, Іванава, Слонім і Бялынічы. Наступным стане Добруш – горад у Гомельскай вобласці.

Ганна Лагун



Святыні нас яднаюць у народ

Гэтай восенню ў дваццаць восьмы ўжо раз па вызначаным маршруце з Мінска рушыла Навукова-асветніцкая міжнародная экспедыцыя "Дарога да Святыняў" з Благадатным Агнём ад Гроба Гасподняга. У дарогу па гарадах і вёсках Бацькаўшчыны скіраваўся калектыў, склад якога ад пачатку першых экспедыцый амаль не змяніўся: вядомыя святары, гісторыкі, літаратары, дзеячы мастацтваў. Іх мэта – пабываць у мясцінах, найбольш значных для нашай гісторыі, дазнацца пра нешта дагэтуль малавядомае і самім, у часе сустрэч з людзьмі, данесці новыя веды пра мінуўшчыну тых мясцін.







Паяднальнымі сімваламі экспедыцыі з першага яе дня застаюцца лампада, запаленая ад Благадатнага Агню ля Гроба Гасподняга ў Ерусаліме, і цудадзейны абраз: ён быў знойдзены на Святым полі пад Баранавічамі, дзе пакінулі сляды многія войны мінулых стагоддзяў. У гарадах і вёсках з найвялікшай пашанаю сустракаюць лампаду і абраз: з імі святары асвячаюць школы, бальніцы, установы адукацыі, сямейныя дзіцячыя дамы. Агонь ад лампады пасля сумеснага набажэнства перадаецца на свечкі прыхаджан, і яны нясуць тое святло-цеплыню дадому: як сімвал адзінства, якое запавядалі нашы продкі.

Праз Мінскую і Брэсцкую вобласці прайшла сёлетняя экспедыцыя "Дарога да Святыняў". Варта нагадаць, што ўдзельнікі яе за мінулыя гады прайшлі-праехалі дзясяткі тысяч кіламетраў.

Ад аднаго паселішча да наступнага мы ехалі на аўтобусе, бліжэй да тых, хто сустракае экспедыцыю, падыходзілі пешшу, і далей ужо разам з мяцовымі жыхарамі рухаліся ў Хросным ходзе. Сумесныя набажэнствы у мясцовых храмах, творчыя сустрэчы ў клубах і палацах культуры, урокі пісьменства ў школах ладзіліся ў гарадах і вёсках з раніцы да вечара. Не абыходзіў наш маршрут і знакавыя мясціны: ля мемарыялаў і брацкіх магіл воінаў і партызан, бязвінных ахвяраў вайны святары разам з усімі ладзілі памінальныя набажэнствы.

Даследуючы мінулае і ролю царквы ў нашай агульнай гісторыі, удзельнікі экспедыцыі наведваюць мясціны, звязаныя з жыццём славутых святароў, вернікаў, якія пакінулі след ва ўдзячнай памяці нашчадкаў. На сёлетнім маршруце, напрыклад, быў зроблены прыпынак у райцэнтры Узда, каб пабываць на месцы пахавання святога пакутніка Міхаіла Навіцкага. І вядомага святара Пятра Грудзінскага ўзгадвалі і ў ягонай роднай вёсцы, сённяшнім аграгарадку Цімкавічы Капыльскага раёна. Таксама ўдзельнікі пабывалі ва ўрочышчы Ізбійскі Бор Ганцавіцкага раёна: у даўніну там быў знойдзены цудадзейны абраз Маці Божай.

Усюды, дзе бывала экспедыцыя, яе ўдзельнікі разам з жыхарамі садзілі маладыя дрэўцы, якія штогод пашыраюць Усебеларускі Сад малітвы. Такая традыцыя склалася даўно. Пасаджаныя за мінулыя гады па ўсёй краіне многія сотні яблынек, дубкоў, бярозак растуць-падрастаюць на галоўных плошчах, у скверах, каля храмаў і вакол мемарыялаў. Усебеларускі Сад малітвы – яшчэ адзін каштоўны, жывы сімвал экспедыцыі, які памкнёны ў будучыню і будзе нагадваць нашчадкам пра сённяшні шлях наш да духоўнасці, да згоды, да адзінства.

Яўген Пясецкі
Фота аўтара





1. Лампада з Благадатным Агнём, запаленым каля Гроба Гасподняга.

2. Экспедыцыя атрымала ў дарогу з рук мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Новы Запавет, перакладзены на беларускую мову.

3. На дарозе ў Ганцавіцкі раён экспедыцыю вітаюць вясковыя спевакі й музыканты.

4. Да сустрэчы экспедыцыі ганцавіцкія майстры вышывання падрыхтавалі выставу традыцыйнай творчасці.

5. Удзельнікі экспедыцыі наведалі Этнаграфічна-літаратурны музей Якуба Коласа ў вёсцы Люсіна (Ганцавіцкі раён). У тых мясцінах у 1902-1904 гадах будучы пясняр працаваў настаўнікам.

6. Чарговы прыпынак на шляху – ля асвечанай крынічкі.

7. Частку дарогі ўдзельнікі экспедыцыі праходзяць пешшу.



ВЕСТКІ З ДЫЯСПАР

З песень пачынаецца Радзіма

Нарвскае беларускае таварыства "Сябры" правяло Фэст беларускай песні "Радзіма наша – Беларусь"



Удзельнікі мерапрыемства. Фота на памяць

Праходзіў фэст у святочны дзень (14 жніўня: Мядовы Спас), удзельнікі й госці сабраліся ў нарвскім Доме народаў, пры тым выконваліся прынятыя ўрадам Эстоніі абмежавальныя антыковідныя меры. Імпрэзу падтрымала Амбасада Беларусі ў Эстоніі – за тое Бацькаўшчыне вялікая ўдзячнасць. Адзначым, што задумвалі мы зладзіць песеннае свята яшчэ у 2019-м, і марылі правесці яго ў маі 2020-га ў Нарве ды Таліне, з запрашэннем творчых калектываў з Беларусі. Але ж, як кажуць, не лёс: былі ўведзены ковідныя абмежаванні. З-за іх ажно чатыры разы пераносіліся тэрміны фэсту, і на пяты толькі ўдалося ажыццявіць задуманае – праўда, у няпоўным варыянце. І маем цвёрды намер, назапасіўшы досвед, у будучыні разгарнуць задуманае ў належным фармаце. Альбо хоць па інтэрнэце з творчымі калектывамі, якія з намі ў сяброўстве, будзем ладзіць у часе фэсту міжнародныя тэлемасты.

Шкада, вядома, што не змаглі нас парадаваць сваёй творчасцю на гэты раз ні артысты з Беларусі, ні сябры-беларусы з латвійскага Даўгаўпілса. З якімі мы ў супрацы, абменьваемся досведам правядзення падобных імпрэзаў. І ўсё ж такі фэст адбыўся! З Таліна прыехалі танцавальны калектыў "Горлица" ды ансамбль беларускага таварыства "Лёс", з Йыхві – беларусы з суполкі "БЭЗ". Песні пра Беларусь і Нарву спяваў Андрэй Маркус. І, вядома ж, сагравалі сэрцы ўдзельнікаў і гасцей фэсту прыгожымі песнямі гаспадары свята: ансамбль таварыства "Сябры".



Выступае ансамбль таварыства "БЭЗ"

Гасцямі на фэсце былі прадстаўнікі нарвскіх нацыянальна-культурных таварыстваў, дэпутаты гарадскога сходу. З вітальным словам да ўсіх звярнуўся Першы сакратар Амбасады Беларусі ў Эстоніі Аляксей Зубко.



Аляксей Зубко

І яшчэ адна прыгожая падзея прыйшлася да месца ў нашым песенным фэсце. Нарвскія "Сябры" і ўсе госці віншавалі актывістаў нашай суполкі, сямейную пару Ларысу і Васіля Ждановічаў з 55-годдзем сумеснага жыцця. Дарэчы, у свой час гэта спадар Васіль і ўзначальваў суполку. (Мы знайшлі ў архіве публікацыю "Такая ўвага акрыляе" (ГР, 17.12.2014) Людмілы Аннус, цяперашняй кіраўніцы суполкі. Яна – пра тое, што павіншаваць з 15-гадовым юбілеем суполку "Сябры" ў Нарву прыязджалі паважаныя госці: на здымку ганаровую грамату Васілю Ждановічу ўручае тагачасны Амбасадар Анатоль Сцёпусь. – **Рэд.**).

Напрыканцы фэсту "Радзіма наша – Беларусь" намеснік старшыні гарадскога сходу Нарвы Тармо Таммістэ ўручыў яго удзельнікам падзячныя лісты й кветкі.

Віктар Байкачоў,
г. Нарва, Эстонія

Ад рэдакцыі . Віктар Байкачоў разам з Таццянай Макаранкай даслалі й своеасаблівую справаздачу аб дзейнасці суполкі "Сябры" ў летнюю пару, калі ў Эстоніі паслабляліся ковідныя абмежаванні. Таццяна расказала, як рэалізавана была ранейшая задумка: правесці намаганнямі беларусаў Нарвы летні дзіцячы лагер пад дэвізам "Спазнай культуру Беларусі!". Цэлы тыдзень працаваў лагер. Дзяцей і падлеткаў, якія маюць родавыя карані ў Беларусі, знаёмілі з беларускай сімволікай – і дзяржаўнай, і нацыянальнай. Пры тым высветлілі: у Эстоніі ды Беларусі нацыянальная кветка – васілёк. І быў майстар-клас, на якім усе рабілі ў яго выглядзе эфектнай брошкі.

Было й "смачнае" знаёмства з нацыянальнай кухняй Беларусі. На дасланых здымках бачым і гатаванне дранікаў, якія потым усе са смакам елі. Запомнілася юным таксама паездка ў Талін – з наведваннем Амбасады Беларусі. Прычым Амбасадар Вячаслаў Качанаў асабіста сустрэўся з удзельнікамі лагера, цікава распавёў ім пра гісторыю беларускай дзяржавы, славутасці, дасягненні Рэспублікі Беларусь. Далей было наведванне Талінскай тэлевежы, удзел у адукацыйнай праграме і нават прымерка на сябе ролі вядучага канала тэленавін.

Заўважым, што ідэя правядзення лагера – Таццяны Макаранкі, яна ж напісала праграму лагера ды паспяхова яе рэалізавала. І адзін з дзён прысвечаны быў народнаму майстэрству: дзяцей і падлеткаў знаёмілі з кавальскім, ганчарным, бандарным рамёствамі, лозапляценнем, саломапляценнем, разьбой па дрэве, валяннем з воўны. І ўсё гэта – з практычнымі заняткамі, майстар-класамі! Сапраўдным адкрыццём для юных было, што сметанковае масла можна збіваць не міксерам – у драўлянай маслабойцы. І ўвечары ўсе частавалі бацькоў дома дзівосным маслечкам, прыгатаваным так, як рабілі раней сяляне ў Беларусі. Ну і гульнямі – з нацыянальным беларускім каларытам – лагерная змена ўсіх парадавала. З допісаў вынікае: майстар-класы праводзілі Людміла Стулава й Надзея Лісюк, дапамагалі ў рабоце Таццяне Макаранцы Людміла Аннус, Сафія Сяккі, Віктар Байкачоў.

І ў Нарвскім доме апекі пабывалі "Сябры" – ужо традыцыйна, як шэфы. Так робяць штогод у апошняй дэкадзе ліпеня. На гэты раз паказалі пажылым людзям невялікі відэафільм пра Беларусь, паспявалі беларускія песні. Віктар Байкачоў пахваліўся ў допісе: нават ён спяваў! Цёплай і душэўнай атрымался сустрэча. І, як заўсёды пасля заканчэння канцэрта, "Сябры" перадалі жыхарам Дома апекі смачны пачастунак: вялікі пірог да чаю.

Як бачым: і на малых, і на вялікіх – людзей паважанага веку – хапае сіл у нарвскіх "Сяброў". Так трымаць! Памятайце, дарагія энтузіясты: вашыя справы, такая народная дыпламатыя надзвычай важныя. Бо менавіта па іх "простыя людзі" ў свеце мяркуюць, хто такія беларусы, што такое Беларусь.

ГОНАР І СЛАВА

З крыніц народных прыгажосць

На выставе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што ладзілася да Дня народнага адзінства ў Палацы Незалежнасці Беларусі, дэманстраваліся вырабы народных майстроў з розных рэгіёнаў краіны



БЕЛТА

Творчасць, як сцвярджаюць знаўцы, ёсць стан душы. І мяжа, што аддзяляе дасведчанага ў тонкасцях майстэрства рамесніка ад мастака, надзвычай тонкая. У тым можна было пераканацца ў Зале ўрачыстых цырымоній Палаца Незалежнасці, дзе працавала пляцоўка "Пояс адзінства". Дэманстраваліся лепшыя ўзоры традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў, адметныя вырабы майстроў: ганчароў, лозапляцельшчыкаў, ткачых, вышывальшчыц, а таксама тых, хто ствараe прыгажосць у тэхніках маляванкі, выцінанкі ды іншых. Па творах-узорах бачна было, якія традыцыі пераважаюць у розных рэгіёнах, маюць развіццё. Як адзначалі арганізатары выставы, яны хацелі прадставіць, як традыцыйныя віды народных мастацкіх рамёстваў сёння трансфармуюцца ў дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

На адкрыцці выставы Міністр культуры Анатоль Маркевіч слушна казаў: без мінулага няма будучыні. А выстава "Пояс адзінства" якраз і паказала пераемнасць традыцый. Несумненна, паяднoўвае нас усіх вялікая гісторыя. Але ж паядноўваюць і агульныя культурныя коды, мастацкія вобразы, што ад нараджэння ўваходзяць у нашае жыццё. Народныя майстры, рамеснікі, прыўносячы ў справу часцінку сваёй душы, доўжаць спрадвечныя традыцыі. Не даюць перарвацца ніцінам творчасці, праслаўляюць сваёй працай краіну і народ. Пры тым у творчых праявах майстры кожнага рэгіёна маюць свае адметнасці.

Іван Іванаў

ДАЛЁКАЕ – БЛІЗКАЕ

Родныя людзі на Байкале

У Іркуцкай вобласці прайшлі Дні беларускай культуры. Яны прысвячаліся 25-годдзю Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага і ладзіліся па ініцыятыве яго актывістаў.



Здорава сустракаць такія дэлегацыі! Калі ў міжнародны Іркуцкі аэрапорт прызямліўся самалёт з гасцямі з Беларусі (12 чалавек!), то не было межаў радасці Алены Сіпаковай: прама там супляменнікаў і вітала кіраўніца Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі “Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага”. І сам вялікі, сямідзённы праект “Дні беларускай культуры ў Іркуцкай вобласці” (з 21 па 29 жніўня) быў задуманы ў гонар юбілею ІТБК. А клопатаў было, каб усё здзейснілася! Урэшце ж ініцыятыву беларусаў Прыбайкалля падтрымаў расійскі Фонд прэзідэнцкіх грантаў. Праект увабраў цэлы шэраг імпрэзаў, скіраваных на прадстаўленне традыцыйнай і сучаснай культуры беларусаў і беларускіх перасяленцаў Іркуцкай вобласці. Далучыліся да правядзення Дзён і некалькіх муніцыпальных утварэнняў. І для беларусаў Прыбайкалля добрая нагода была паказаць свой патэнцыял, удакладніць планы. А мінская дэлегацыя прыбыла, каб падтрымаць супляменнікаў ды яшчэ раз годна прадставіць беларускую культуру ў рэгіёне. І потым сем дзён удзельнікі Дзён беларускай культуры вандравалі па Іркуцку, па Байкале.

Хто ў дэлегацыі? Цэлы народны фальклорны гурт “Вербіца” на чале з мастацкім кіраўніком Алесем Свірскім. У гурце: Вольга Ладуцька, Дзмітры Бубіч, Аляксандр Алейнік, Марына Сцеблева, Аляксандра Валасач, Андрэй Прымака, Марыя Пашук, Таццяна Краснабаева. Яшчэ ў дэлегацыі – народны майстар Беларусі па выцінанцы Вольга Бабурына. Яшчэ – Аляксей Галіч ды Ілья Арыстаў: фальклярысты, спявающь дуэтам традыцыйныя песні. Першы да таго ж і беларускія аўтарскія песні таленавіта выконвае, другі – майстар па вырабе капелюшоў.

У першыя дні госці наведалі архітэктурна-этнаграфічны музей “Тальцы”, сучасную арт-галерэю “CheGuevara”, студыю іркуцкага “Радио Шансон”, славуты “Камень Чэрскага” (пасёлак Ліствянка) ды Байкальскі лімналагічны музей (а навука лімналогія – гэта азёразнаўства, і ў Расіі ёсць толькі адзіны музей аднаго возера). І яшчэ былі сустрэчы ў рэдакцыі інфармацыйнага агенцтва Байкал24, у дзяржаўнай тэлерадыёвяшчальнай кампаніі ды "прагулкі па старым Іркуцку". Пры тым былі праведзены канцэрты, госці паўдзельнічалі ў прамых эфірах і ранішніх перадачах для жыхароў Іркуцка. Спявалі беларускія песні гурт “Вербіца” ды Ілья Арыстаў і Аляксей Галіч.

Да 25 жніўня ў Іркуцку прайшлі й майстар-класы па выцінанцы ад Вольгі Бабурынай, кіраўніцы секцыі выцінанкі Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Майстрыха паспела за кароткі прамежак часу і выцінанку стварыць, і расказаць ахвочым пра гісторыю ўзнікнення гэтага віду народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Як вядома, слова выцінанка паходзіць ад слова выцінаць (выразаць з паперы): гэта ўзор з паперы. На Беларусі выцінанка вядомая з XV стагоддзя: тады ажурныя выразкі з паперы – “кустоды” – пачалі падкладваць пад сургучовую ці васковую пячатку, калі яна ставілася на дзяржаўных дакументаў Вялікага Княства Літоўскага. Выразкі з паперы ўпрыгожвалі шляхецкія жаночыя альбомы, былі неад’емнай часткай яўрэйскіх вясельляў, з часам сталі дэкорам у вясковых хатах і забаўкай для дзяцей.

Зладзілі ў Іркуцку і семінар-практыкум па беларускіх народных танцах ад гурта “Вербіца”. Мясцовыя харэографы даведаліся шмат цікавага, і веды спатрэбяцца ім у працы.

З 25 па 28 жніўня Дні беларускай культуры прымалі ўжо Іркуцкі ды Альхонскі раёны: там праходзілі вулічныя канцэрты, майстар класы. Імпрэзу пад назвай “Вялікі беларускі канцэрт” прымала вёска Тургенеўка. Да гасцей з Беларусі далучыліся творчыя калектывы рэгіёну: з Куйтунскага, Усольскага, Іркуцкага раёнаў. Гучалі цудоўныя беларускія песні, гледачы розных узростаў цёпла прымалі артыстаў. І там жа Ілья Арыстаў правёў майстар-клас: паказаў, як рабіць традыцыйны саламяны капялюш. Жыхарам Тургенеўкі, дзе здаўна жывуць перасяленцы з беларусіх зямель, прыйшліся даспадобы песні, танцы артыстаў з гістарычнай Бацькаўшчыны, іх адметныя касцюмы, мова – з тымі слоўцамі, што чулі ад дзядоў-прадзедаў, і самі часам ужываюць. А дзецям тым, што былі на канцэрце, вялікай радасцю было дакрануцца да цымбалаў, пастукаць па барабане.

Ужо непасрэдна пры возеры Байкал 27 жніўня прайшлі апошнія майстар-класы, канцэрт “Вербіцы”: на штогадовым фестывалі музыкі “Байкал Live”. Пад бурныя авацыі беларускія музыкі выйшлі на сцэну, гралі-спявалі беларускія мелодыі-песні, а таксама й тую, што стала хітом Дзён: “Велічным морам”. Яна – пра мудрасць і сілу Байкала, пра сібірскіх беларусаў ды іх гістарычную радзіму. Бард Алесь Камоцкі напісаў песню спецыяльна для “Сустрэчы беларусаў свету на Байкале”-2015. А сёлета была ўжо трэцяя такая сустрэча. І пра творчасць ішла ў часе яе размова, і пра зберажэнне этнаграфічнага матэрыялу, фальклору перасяленцаў-беларусаў. Згадвалі каштоўны досвед: напісанне сацыяльна значных праектаў, распрацоўка этна- праектаў і маршрутаў для турыстаў. “Сустрэча беларусаў свету на Байкале”-2021 сабрала прадстаўнікоў Іркуцкай вобласці, Масквы, Мінска, Маладзечна, і ў гісторыю праекту яна ўжо ўвайшла як самая цёплая і душэўная – асабліва на фоне падзей апошніх гадоў.

Праводзячы гасцей, у аэрапорце Алена Сіпакова казала, што ў будучыні ІТБК імя Яна Чэрскага прадоўжыць падобныя праекты, каб у іркуцян была магчымасць знаёміцца з традыцыйнай і сучаснай беларускай культурай. Бо гэта ж, нагадала, і ёсць галоўная мэта дзейнасці суполкі ўжо 25 гадоў.

Дарэчы. Як паведаміла ў рэдакцыю Алена Сіпакова, у гонар юбілею ІТБК імя Яна Чэрскага сёлета былі паяднаныя паспяховыя праекты суполкі: Дні беларускай культуры, гарадскі праект "Беларусь запрашае сяброў", школьны міжнацыянальны фэст “Сузор’е дружбы”, міжнародная сустрэча “Беларусы свету на Байкале”. Вяліся перамовы аб прыездзе на Байкал беларусаў з Латвіі ды Іспаніі – а такія сустрэчы наперадзе. Кіраўніца суполкі ўдзячная ўсім, хто спрыяў рэалізацыі праекта. Відэасюжэт, які прайшоў па Іркуцкім тэлебачанні, можна пабачыць па спасылцы https://youtu.be/D5TjbGriOD0 Ёсць таксама ўжо ў інтэрнэце і майстар-клас па выцінанцы: https://youtu.be/F7Imn53pKjw

Цяпер пайшоў розгалас ад тых сустрэч у сацсетках, чатах. Ідзе абмен фотаздымкамі, музычным матэрыялам. І сумесныя далейшыя праекты – абавязкова будуць. Розныя відэасюжэты (скажам, канцэрт Аляксея Галіча і “Вербіцы” у Арт-галерэі “Чэ Гевара”, прэс-канферэнцыя, майстар-клас па выцінанцы) з’яўляюцца ў інтэрнэце. Рыхтуецца анлайн-сустрэча беларусаў Іркуцка з майстрыхай Вольгай Бабурынай: каб без спеху кожны ахвочы мог зрабіць сваю выцінанку. Робіцца выніковы відэафільм: з канцэртнымі нумарамі, яркімі эпізодамі Дзён беларускай культуры ў Іркуцкай вобласці.

Анастасія Спяшыліна,
г. Іркуцк
Фота аўтара
і з сацыяльных сетак

СЯБРОЎСКІ ФАРМАТ

На хутары Сцігас – вясёлыя госці

Сябры суполкі “Мара” з Ліепаі нават адпачынак на прыродзе праводзяць з беларускім каларытам.

Пакуль яшчэ не насталі моцныя халады, гараджанам варта як мага часцей бываць на прыродзе. І сябры Ліепайскай беларускай суполкі “Мара” вырашылі сабрацца 5 верасня за межамі горада, каб разам правесці лета. Дарэчы, чаму б і не: можна Праводзіны лета зрабіць традыцыйным святам. Сабраліся мы ў сяброў – беларуса Віктара Кукуця ды ягонай жонкі Наталлі Сямдзянкінай на хутары “Сцігас”. Гэта прыгожае месца ў Гробінскім краі, кіламетраў за 15 ад Ліепаі.

Цёплую сустрэчу ўпрыгожылі спевы гурта беларускай песні “Паўлінка”. Задушэўна ды надзвычай арганічна гучалі на сонечным пленэры, у натуральных зялёных дэкарацыях беларускія песні “Вёсачка”, “Самаварчык”, “Пажаданне” ды іншыя. Кіраўніца гурта Жанна Буйніцкая правяла забаўляльныя гульні. У ходзе якіх, прыкладам, трэба было напісаць як мага хутчэй на дошках “Добрага дня, Беларусь!” альбо з пэўнай адлегласці трапіць бульбай у мех. А з нагоды Дня беларускага пісьменства, што адзначаўся ў Беларусі ў той дзень, спадарыня Жанна правяла віктарыны й конкурсы, расказала пра само свята.

Вельмі ўразілі ўсіх вялікія сабакі гаспадароў – Гера і Бастон, якія аказаліся на дзіва дружалюбнымі. Мы частаваліся таксама беларускімі стравамі, пілі гарбату з сапраўднага тульскага самавара – і сфатаграфаваліся з ім. Ды яшчэ “пілі”, убіралі ў сябе навакольную прыгажосць (і лес атачае хутар…), дзяліліся ўспамінамі. Пры тым Віктар Бяляеў, раней удзельнік “Паўлінкі”, згадаў, што 7 гадоў таму гурт упершыню выступіў на прыватным святе: у гонар 50-годдзя Віктара Кукуця. І потым як з меха пасыпаліся ансамблю іншыя запрашэнні на вечарыны й святы. Так што “сяброўскі фармат” беларускіх сустрэч – будзем прадаўжаць.


Сябры “Мары” на хутары Сцігас, з тульскім самаварам

Анжэла Фаміна, г. Ліепая
Фота аўтара

СКАРБЫ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

Ажыў гадзіннік вежавы



На вежы касцёла ў Будславе (Мядзельшчына), якую не зачапіла полымя пажару ў маі 2021-га, пасля доўгага перапынку пачаў ісці трохсотгадовы гадзіннік. Цяпер ён падае свой голас праз кожныя 15 мінут – у напамін, што плынь часу няспынная.



Нацыянальны санктуарый Маці Божай Будслаўскай, дах якога згарэў у маі 2021-га, аднаўляецца агульнымі намаганнямі. Людзі збіраюць на рамонт святыні грошы, а ўлады абяцаюць правесці яго ў найбліжэйшы час. Будслаўскі касцёл – гэта каталіцкі храм Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў аграгарадку Будслаў, помнік архітэктуры і гісторыі. Цудадзейны абраз Маці Божай Будслаўскай, які дагэтуль зберагаўся пад дахам храма – не толькі вялікая хрысціянская святыня, але і выдатны шэдэўр сакральнага мастацтва, неацэнны набытак усяго беларускага народа. Урачыстасці ў гонар Маці Божай Будслаўскай у Нацыянальным санктуарыі, вядомыя як Будслаўскі фэст і частка нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, сёлета праходзілі 2-3 ліпеня, і тысячы пілігрымаў пабачылі ў тым, што ажыў гадзіннік вежавы, добры знак. З вежы, якую не закранула полымя, сёння кожныя 15 мінут б'юць званы трохсотгадовага гадзінніка. Пад іх бой аб лепшай долі для сваіх нашчадкаў маліліся яшчэ нашы прабабулі і прадзеды.

Гадзіннік на вежы касцёла ў Будславе далёка чуваць. Яго аднавіў напярэдадні Будслаўскага фэсту прафесійны рэстаўратар Аляксандр Петракоў. Гэта своеасаблівая ахвяра майстра касцёлу. Хоць ён і праваслаўнага веравызнання, ды з павагай ставіцца да прадстаўнікоў розных канфесій.


"Задача такая не стаяла: каб паспець нам да пэўнага часу, – гаворыць рэстаўратар. – Патрэбна было якасна выканаць сваю работу. Але калі згарэў дах касцёла, то архіважным для ўсіх, у тым ліку і для мяне, стала закончыць працу напярэдадні чарговага фэсту. Такім чынам хацелася паказаць, што ўсе нягоды і беды мінаюць".

Сёння Аляксандр афармляе пашпарт адноўленага гадзінніка з падрабязным яго апісаннем: гэта дапаможа, калі тое спатрэбіцца, іншаму рэстаўратару ў будучыні разабрацца ў складанасцях механізма і ў чарговы раз вярнуць гадзіннік да жыцця. Петракоў хоча высветліць, дзе і кім быў зроблены рарытэт. І даследаванне збіраецца навукова абгрунтаваць. "Спачатку было меркаванне, што стварыў гадзіннік нейкі ўмелец у мясцовай кузні. Але ў механізме выкаваны толькі корпус, і зроблены ён па-майстэрску – самаробкай цяжка назваць. На маю думку, гадзіннік выраблялі арцеллю, хутчэй – на Нямеччыне, якая славілася такімі майстрамі. Для мяне важна было захаваць не толькі старадаўні корпус гадзінніка, але і ўсе дэталі ўнутры, якіх налічваецца больш за 350".

Такіх падыходаў патрабуюць і законы музейнай рэстаўрацыі. Петракоў 15 гадоў працуе мастаком-рэстаўратарам у Нацыянальным мастацкім музеі: аднаўляе старадаўнія прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Працуе з рэчамі з металу, шкла, парцаляны, керамікі. З музейнай калекцыі ў яго рукі трапляюць металічныя бюсты, настольныя кампазіцыі з бронзы, чыгуну – практычна ўсё, акрамя жывапісных твораў і вырабаў з дрэва. Яму цікава ўзнаўляць прадметы рэлігійнага культу. "Гэта мой кірунак, – тлумачыць майстар. – Можна сказаць, з аднаўлення праваслаўных каштоўнасцяў і пачаўся ў мяне творчы рост: са звычайнага ювеліра да рэстаўратара старадаўніх рэчаў. У прафесію патрапіў з 18 гадоў. Спачатку асвойваў тэхнікі апрацоўкі металу як прафесійны ювелір, затым вырашыў перайсці ў больш вузкую касту рэстаўратараў. Для таго пачаў вывучаць літаратуру (не было яшчэ інтэрнэта), пераключыўся на старадаўнія прадметы мастацтва і розныя рэдкія рэчы. У рукі мне пачалі трапляць праваслаўныя абразы, і я рэстаўраваў іх металічныя аклады. Паднаўляў іконы вялікія і маленькія, з розных цэркваў і прыватных калекцый".

Рэстаўратары часта працуюць у пары. Шмат прадметаў рэлігійнага культу праваслаўнай і каталіцкай канфесій Петракоў аднавіў разам з Аляксандрам Лагуновічам-Чарапко – ён спецыялізуецца на жывапісе. Гадоў тры таму майстры разам паехалі ў Будслаўскі касцёл, каб азнаёміцца з яго архітэктурнымі асаблівасцямі. Там пазнаёміліся з ксяндзом Дзмітрыем Дубовікам, разгаварыліся ды атрымалі ў працу некалькі прадметаў культавага прызначэння. Для касцёла Петракоў адрэстаўраваў старадаўні Будслаўскі крыж-пацыфікал канца XVI – пачатку XVII стагоддзяў. Пасля аднавіў 280-гадовую манстранцыю (ёмістасць для дэманстрацыі Святога Прычасця). Ён жа дапамог замяніць шкло на цудадзейным абразе Маці Божай Будслаўскай.

"Будслаўскі касцёл – адзін з найцікавейшых архітэктурных помнікаў у Беларусі, нароўні з Кафедральным саборам Святога Францыска Ксаверыя ў Гродне, – гаворыць рэстаўратар. – У адрозненне ад многіх старадаўніх збудаванняў, якія дайшлі да нашага часу у разграбленым стане, касцёл у Будславе напоўнены рознымі старадаўнімі каштоўнасцямі. Сярод іх мяне зацікавіў вежавы гадзіннік. Я вельмі хацеў атрымаць яго ў працу – і атрымаў. Тое не было выпадковасцю – хутчэй Божым провідам".



Аляксандр Петракоў адладжвае механізм гадзінніка

Яму з дзяцінства падабаліся розныя гадзіннікі. Першы будзільнік, які сабраў, адразу не запрацаваў, давялося даводзіць яго да ладу. З таго часу майстар адладзіў, "ажывіў" нямала гадзіннікаў. І хоць не лічыць сябе прафесійным гадзіншчыкам, ды ведае прычыны, якія могуць весці да паломкі механізма, і можа прадухіліць праблему. Дома ў Аляксандра ўжо цэлая калекцыя адраманатаваных гадзіннікаў. Гэта ў большасці настольныя камінныя гадзіннікі невялікага фармату і некалькі насценных. Сваю працу над Будслаўскім вежавым гадзіннікам ён лічыць на сённяшні дзень самай важнай. Яна вялася ў Мінску амаль два з паловай гады. Па словах майстра, сталь механізма парушыла карозія, латуневыя падшыпнікі моцна знасіліся, некаторыя валы былі пагнутыя і мелі дэфекты, знайшоў і фізічныя паломкі, асобныя дэталі прыйшлося замяніць. Але найбольш складана было разбіраць і збіраць гадзіннік: механізм толькі ў такім выглядзе й можна было спусціць з вежы, а пасля рэстаўрацыі падняць на яе. Прывад шасцярэнек (барабаны і тросы, якія апускаюцца з грузам уніз вежы на 40-45 метраў) грувасткі і аб'ёмны, што не давала магчымасці выпрабаваць рэстаўраваны гадзіннік у пакаёвых умовах. Манціравалі ж яго на вежы храма ўтрох: Аляксандр Петракоў, Аляксандр Лагуновіч-Чарапко і Аляксандр Лабус. Пры тым спяшаліся паспець да Будслаўскага фэсту.

Пасля ўстаноўкі гадзінніка на ранейшае месца прыйшлося майстру яшчэ месяц ездзіць у Будслаў, каб адкарэктаваць ягоны ход. І ўсе намаганні таго вартыя: гадзіннік цяпер паказвае час дакладна.

"Зіма для яго можа стаць сапраўдным выпрабаваннем: холад і вільгаць не лепшым чынам уплываюць на механізм. Гадзіннік пачынае ці то спяшацца, ці то адставаць. Думаю, прыйдзецца ім апекавацца і надалей, бо я пакуль адзіны, хто яго добра ведае", – разважае майстар.

Кожны ж дзень механізм падзаводзіць і наглядае за ім ксёндз касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Будславе Дзмітрый Дубовік.

На думку Аляксандра Петракова, гадзінніку на вежы ў Будслаўскім касцёле наканавана доўга жыць. І ён яшчэ папрацуе гадоў сто, а можа й болей.

Ганна Лагун



Так да пажару выглядаў Будслаўскі касцёл

Смакі ды водары з Бацькаўшчыны

У латышскім Даўгаўпілсе выдадзена кніга “Кірмашоўскія прысмакі” ды чакаецца яе прэзентацыя – з дэгустацыяй!

Каштоўную кнігу на беларускай мове падрыхтаваў да друку наш Цэнтр беларускай культуры. У ёй сабрана тры дзясяткі рэцэптаў страў, якія папулярныя сёння ў беларусаў Латвіі. А перад тым, як звярнуцца да кнігі, нагадаю: у Латгаліі, як сцвярджаюць гісторыкі, беларусы з’явіліся ў XVII стагоддзі. Даўгаўпілс цяпер – за 30 кіламетраў ад мяжы з Беларуссю, у сярэдзіне XX – пачатку XXI стагоддзя нашых супляменнікаў жыло тут працэнтаў 7-8 ад усіх жыхароў. Носьбіты беларускай культуры зберагаюць і пашыраюць сваю мову, песні, танцы, адзначаюць народныя святы, зберагаюць адметнае адзенне ды харчовыя звычкі й за межамі этнічнай радзімы. Каб рабіць тое сістэмна, мы штогод ладзім увосень Міжнародны фэст народнай культуры “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе”. Ён збірае аматарскія творчыя калектывы беларусаў з Латвіі, Літвы, Эстоніі, а таксама Беларусі. Фестываль – частка й святочнага культурнага асяроддзя ў Латгальскім рэгіёне Латвіі. Беларусы славяцца гасціннасцю, таму на “Беларускім кірмашы ў Даўгаўпілсе” гасцей заўсёды частуюць традыцыйнымі стравамі нацыянальнай кухні. Ды вось праблема: у 2020-м пандэмія каронавіруса й звязаныя з ёй абмежаванні перанеслі наш фэст у віртуальны фармат, а пачастункі – на старонкі кнігі “Кірмашоўскія прысмакі”. Як вядома, у сістэме культурных маркераў народа ягоная кухня выступае натуральным нацыянальным феноменам.



ФОТА ЖАННЫ РАМАНОЎСКАЙ

Сяброўкі суполкі "Уздым", прафесійны кухар Алена Кіча (падала ў кнізе рэцэпт бульбяной каўбасы) і Любоў Кавалёва

А цяпер прыгледзімся да зборнік. У ім сабрана 34 рэцэпты смачных страў беларускай кухні, якія папулярныя ў Латвіі. Рэцэптамі дзяліліся мясцовыя беларусы: работнікі Цэнтра беларускай культуры, удзельнікі ансамбляў “Купалінка”, “Лянок”, “Паўлінка”, “Спадчына” і “Пралескі”, актывісты Беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Уздым”, супрацоўнікі Генеральнага консульства Беларусі ў Даўгаўпілсе. Многія з іх родам з Беларусі, некаторыя нарадзіліся ў Латвіі, але ж кухню беларускую лічаць важнай часткай сваёй этнічнай ідэнтычнасці. Мы ж памятаем, як гэтыя стравы гатавалі ў розных рэгіёнах краіны ў нас дома, мама ці бабуля, адмерваючы прадукты, як кажуць у народзе,“на вока”. Гэта не проста зборнік! Гэта непаўторныя смакі ды водары з нашага дзяцінства, з родных мясцін, гэта настальгічныя згадкі пра Радзіму, якія з любоўю перанесены, афармлены на старонкі беларускай кулінарнай кнігі, выдадзенай у Латвіі.



Зборнік, вядома ж, не прэтэндуе на кулінарныя адкрыцці. Мы не рушым стэрэатыпы пра беларусаў і верныя традыцыям: вялікая частка страў, прадстаўленых у кнізе – з бульбы. Яны ўсе навідавоку, паўсядзённыя харчовыя перавагі нашыя ды нашых родзічаў-сваіх-блізкіх людзей: дранікі, клёцкі, калдуны, бульбянікі, бульбяная каўбаса й бабка, ды трохі менш вядомыя ў сённяшнім часе кнышы, сашні, шышкі альбо сарока. А разнастайнасць беларускай кухні дэманструюць рэцэпты мясных і рыбных страў, супоў і салатаў, печыва ды ласункаў.

Зборнік ярка, з густам афармлены ў беларускім стылі, “прыпраўлены” прымаўкамі ды радкамі з вершаў. Большасць аўтараў рэцэптаў сфатаграфаваны ў народных строях у часе нацыянальных фэстаў. Нашчадкі зберагліе рэцэпты страў продкаў, каб традыцыі нашыя жылі “ў песнях, у святах і ў кухні”. Праз асаблівасці нацыянальнай кухні ў кнізе “Кірмашоўскія прысмакі” аўтэнтычна й прыгожа раскрываецца этнічная ўнікальнасць беларусаў.

Маем надзею, што ўсё складзецца належным чынам, каб прэзентацыя кнігі (прычым з дэгустацыяй!) прайшла на фэсце “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе” сёлета ў верасні.

Смачна есці! Прыемнага апетыту! Сыць, Божа!

Жанна Раманоўская,
кіраўніца Цэнтра беларускай культуры Даўгаўпілскай гарадской думы

Ад рэдакцыі. Дасылаючы тэкст пра цікавую справу, здзейсненую ў ЦБК, спадарыня Жанна зазначае ў прыпісцы: “Старонкі зборніка зроблены-звёрстаны па адным прынцыпе – пададзены імя, прозвішча гаспадыні ці гаспадара, месца ў Беларусі, адкуль яго родавыя карані, фота ў нацыянальным строі з нейкай імпрэзы, фота стравы ды аповед, як яе гатаваць. І абавязкова на кожнай старонцы – радкі з верша, прозы ды нейкае беларускае выслоўе пра ежу. Атрымалася смачная ды яскравая кніжка!”

Ідэю выдання падала, зладзіла ўвесь працэс, уклала кнігу – яна, руплівіца Жанна Раманоўская. Выдадзены “Кірмашоўскія прысмакі” (300 асобнікаў) за бюджэтныя грошы ЦБК. І бадай што ўсе рэгіёны Беларусі ў ёй сваімі прысмакамі прадстаўлены, а найболей страў, як і сяброў суполкі, у Даўгаўпілсе з Віцебшчыны: гэта Браслаўскі, Полацкі, Мёрскі, Шаркаўшчынскі, Ушацкі, Верхнядзвінскі, Глыбоцкі, Пастаўскі раёны ды Орша. Кожны аўтар рэцэпта ўжо атрымаў кнігу ў падарунак, а на фэсце “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе” то будуць падарункі ўсім ансамблям-удзельнікам.







І такая ежа ў нас у пашане

Па нашай просьбе спадарыня Жанна даслала каштоўную інфармацыю: пераклік змешчаных у кнізе страў з прывязкай іх да мясцовасцяў тых, хто па гэты час кулінарныя сакрэты продкаў зберагае-памятае ды людзям добрым перадае.

Клёцкі. Жанна Раманоўская (г.п. Ветрына, Полацкі раён, Віцебшчына).

Шышкі. Марыя Памецька (в. Сароча, Астравецкі раён, Гродзеншчына).

Дранікі. Галіна Сантоцкая (м. Міхалішкі, Астравецкі раён, Гродзеншчына).

Бульбяная каўбаса. Алена Кіча (в. Прытыкі, Глыбоцкі раён, Віцебшчына).

Калдуны. Валянціна Анікіна (в. Боркавічы, Верхнядзвінскі раён, Віцебшчына).

Сарока. Яўгенія Гуляева (в. Закор’е, Браслаўскі раён, Віцебшчына).

Бабка. Лілія Воранава (в. Вусаўцы, Мёрскі раён, Віцебшчына).

Кнышы. Інна Валюшка (в. Васіліны, Пастаўскі раён, Віцебшчына).

Сашні. Галіна Сантоцкая (м. Міхалішкі, Астравецкі раён, Гродзеншчына).

Бульбянікі. Ніна Юхноўская (м. Лушкі, Шаркаўшчынскі раён, Віцебшчына).

Катлеты з бульбай. Вера Рагальчук (в. Гулічы, Ляхавіцкі раён, Брэстчына).

Яечня са скваркамі. Юры Галоўка (с. Вялікія Дольцы, Ушацкі раён, Віцебшчына).

Мачанка з блінамі. Жанна Раманоўская (г.п. Ветрына, Полацкі раён, Віцебшчына).

Паляндвіца. Мікалай Раманкевіч (г. Ліда, Гродзеншчына).

Квашаніна. Таццяна Дзянісава (в. Альхоўка, Мёрскі раён, Віцебшчына).

Рулька па-палеску. Інэса Казлоўская (г. Гомель).

Смажаная рыба. Галіна і Чэслаў Шастакоўскія (г. Глыбокае, Віцебшчына).

Вінегрэт. Тэрэса Паўлава (х. Біслы, Браслаўскі раён, Віцебшчына).

Салата па-пастаўску. Валянціна Ліпінская (в. Гута, Пастаўскі раён, Віцебшчына).

Марынаваныя грыбы. Інна Шаўчук (г. Орша, Віцебшчына).

Поліўка. Алена Бучэль (м. Германавічы, Шаркаўшчынскі раён, Віцебшчына).

Халаднік. Алена Радзівонава (г.п. Шаркаўшчына, Віцебшчына)

Зацірка. Марыя Памецька (в. Сароча, Астравецкі раён, Гродзеншчына).

Гарбузянка. Жанна Бяляўская (в. Васюкі, Шаркаўшчынскі раён, Віцебшчына).

Аладкі дражджавыя. Жанна Бяляўская (в. Васюкі, Шаркаўшчынскі раён, Віцебшчына).

Аладкі кабачкова-бульбяныя. Ірына Лапуць (г. Мінск).

Наліснікі. Яніна Юзэфовіч (в. Расалова, Браслаўскі раён, Віцебшчына).

Сырнікі. Нона Міхайлава (в. Чурылава, Мёрскі раён, Віцебшчына).

Хрусты бульбяныя. Інэса Казлоўская (г. Гомель).

Хрушчы мучныя. Надзея Свірковіч (в. Куклі, Радуньскі раён, Гродзеншчына).

Яблычны пірог. Алена Радзівонава (г.п. Шаркаўшчына, Віцебшчына).

Піражкі з яблыкамі. Алена Кавалькова (в. Рацюнкі, Браслаўскі раён, Віцебшчына).

Святочны пірог. Вера Сухарава (г. Мсціслаў, Магілёўшчына).

Журавінавы кісель. Настасся Лукашонак (в. Падварынка, Браслаўскі раён, Віцебшчына).

2021: Год народнага адзінства

Чытайце газету ў інтэрнэце на партале zviazda.by

© “Голас Радзімы”, 2021

Заснавальнік: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Выдавецкі дом «Звязда»”
Галоўны рэдактар Іван ЖДАНОВІЧ
Адрас рэдакцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава, 19. Пакой 19.
E-mail: golas_radzimy@tut.by
Тэлефон: + 375-17-3167668
Рэдакцыйнае пасведчанне №61. Выдадзена 16.07.2018 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Выдавецкі дом «Звязда»”. Дырэктар – галоўны рэдактар Алесь Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Аб’ём выдання: 2 друк. арк.
Падпісана да друку: 29.09.2021 г.
Наклад 167.
Заказ –
Выходзіць 1 раз у месяц
Месца друкавання: Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “БудМедыяПраект”. ЛП №02330/71 ад 23.01.2014. Вул. Веры Харужай, 13/61. 220123 Мінск, Рэспубліка Беларусь
Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца. Пазіцыі рэдакцыі ды аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.